твор уводзіцца ў тканіну фільма так, што захоўвае сваю мастацкую аўтаномію.

Разам з тым існуе больш рухомы, неўсталяваны, нават «дзёрзкі» падыход, калі традыцыйная культура выкарыстоўвацца кінематографам у якасці нарадыйнага прадмета. Такі тып дэмакратызаваных зносін з мастацтвам склаў сутнасць авангарда і з'явіўся вынікам агульнага духоўнага і сацыякультурнага працэсу.

Кіно перажыло два мадэрнісцкіх выбухі:
- перыяд класічнага авангарда (20-я гг. XX ст.);
- перыяд постмадэрнізму (канец 70-х-сярэдзіна 80-х гг.).

У 20-я гг. рэжысеры імкнуліся стварыць такую мастацкую матэрыю, якая б адпавядала ідэі «чыстага кіно», г.зн. такога кіно, якое не запазычвае традыцыйных выяўленчых, літаратурных, тэатральных сродкаў. Кіно быццам бы адасаблівалася ў агульным свеце мастацкай культуры.

Постмадэрнізм на мяжы 70-х гг. зацвердзіў адкрытую фарсава-гарэзлівую манеру кінематаграфічнай «гульні», па ўмовах якой прызнаныя каштоўнасці мастацкай культуры страчваюць права недатыкальнасці і пераўтвараюцца ў забаўныя «пацкі». Імі свабодна маніпулюе рэжысер, руйнуючы ўсялякія аўтарытэты кплівымі намёкамі, вострымі пародыямі, экраннымі эпіграмамі. Кінематограф постмадэрнізму, у першую чаргу, імкнецца адрэфлектаваць сам сябе і таму вымагае з боку гледачоў пэўнай кінаадукаванасці: ведання хрэстаматыйных экранных твораў, ведання рэжысерскіх стыляў.

Граматная методыка дазваляе прадукцыйна выкарыстоўваць у працэсе навучання не толькі традыцыйнае, але і авангарднае кіно. Апошняе, дарэчы, разлічана на больш пчыльную студэнцкую аўдыторыю, якая вылучаецца духоўнай сталасцю, аналітычным складам мыслення і таксама прафесійнай арыентацыяй.

Караеў М.М.,
дацэнт

## ПАДРЫХТОЎКА КІРАЎНІКОЎ-АДМІНІСТРАТАРАЎ У ФРАНЦЫІ
(змест, методыка, арганізацыя)

У Францыі існуе 240 школ, якія рыхтуюць кіраўнікоў для ўсіх узроўняў структур кіравання. Найбольш значная з іх - Нацыянальная школа адміністрацыі (Эколь Насьяналь д'Адміністрасьён - ЭНА), заснавана ў 1946 г. генералам дэ Голем. Школа непасрэдна падпарадкоўваецца прэм'ер-міністру Рэспублікі, а кіраўнікі яе прызначаюцца асабіста прэзідэнтам Францыі. Гэты ўзровень абумоўлены задачамі школы, галоўная з якіх - забяспечыць падрыхтоўку дзяржаўных функцыянераў вышэйшага эшалона палітычнага, эканамічнага, адміністрацыйнага кіравання, а таксама дыпламатычнага корпуса.

Дыпломы ЭНА ў свой час атрымалі былы прэзідэнт Валеры Жыскар д'Эстэн, цяперашні прэзыдэнт Жак Шырак, Мішэль Ракар і іншыя вядомыя кіраўнікі, што сведчыць аб неабмежаваных умовах для кар'еры выпускнікоў.

Конкурс у ЭНА складае ў сярэднім не менш як 50-60 прэтэндэнтаў на месца, а колькасць вакансій усяго 80.

Уступныя іспыты праходзяць у два туры. На першым, завочным туры, адміністрацыя рассылае па ўсіх буйных цэнтрах краіны варыянты пісьмовых заданняў, на якія можа адказаць практычна любы француз, маючы вышэйшую адукацыю і ўзрост не больш як 31 год. Пасля 30 год, лічаць педагогі, пачынаць кар'еру прафесіянала-кіраўніка вельмі цяжка, а ў большасці выпадкаў - марная трата часу.

Прэтэндэнты, якія выйгралі завочны тур, запрашаюцца ў Парыж на другі, вочны, тур экзаменаў, які, ў сваю чаргу, складаецца з двух этапаў. На першым абітурыенту прапануецца на працягу чатырох гадзін адрэдагаваць рукапіс дзелавога тэксту, праявіць навыкі культуры справаводства, веды асноў юрыспрудэнцыі, а таксама арыентацыю ў сучасным грамадскім і дзяржаўным жыцці краіны. На другім этапе за трыццаць хвілін трэба напісаць міні-сачыненне, у якім неабходна паказаць абгрунтаванае выражэнне той ці іншай праблемы ў сферы дзяржаўных ці міжнародных адносін.

Хто прайшоў два этапы, запрашаюцца для гутаркі па выяўленню «ступені адкрытасці», пад якой разумеецца дынамічнасць мыслення абітурыента, здольнасць яго да нестандартнага і творчага мыслення, уменне выклікаць прыхільнасць у суразмоўцы весці гутарку і інш.

Па выніках экзаменаў праводзіцца залічэнне, і слухачы адразу падаюць не ў аўдыторыю, а на гадавую стажыроўку, палова якой праходзіць у дзяржаўных органах кіравання, а другая ў апаратах кіравання буйных фірмаў і прадпрыемстваў, прычым не толькі французскіх, але і іншых краін Еўропы, ЗША, Канады, Японіі. За гэты тэрмін стажор знаёміцца з тэхналогіяй кіраўніцкай працы, аналізуе рэальнае становішча спраў, атрымлівае навыкі дзелавога супрацоўніцтва, завязвае асабістыя сувязі. Пасля заканчэння стажыроўкі пачынаецца вучэбны працэс у сценах ЭНА, дзе на працягу года навучэнцы ў складзе невялікіх груп (10-12 чалавек) слухаюць лекцыі, абмяркоўваюць сітуацыі, якія ўзніклі ў час стажыроўкі. Вучэбная праграма складаецца ўсяго з пяці дысцыплін: рэдагаванне юрыдычных тэкстаў, тэорыя і практыка міжнародных адносін, эканоміка (на мікра- і макраўзроўні,

сацыяльныя адносіны ў працоўных калектывах), мэнеджмэнт (ў тым ліку бухгалтарскі ўлік і фінансы, тэхналогія кіраўніцкага кантролю, прыемы і метады сацыяльнай псіхалогіі), мікракамп'ютэрная тэхніка.

У лік прадметаў не ўваходзяць такія, як бізнес і маркетынг. Французскія кіраўнікі і эканамісты лічаць, што абедзве навукі прыйшлі з ЗША, таму вывучаць іх лепей у той краіне, дзе яны дасканала развіты.

Акрамя лекцый, семінараў, лабараторных заняткаў, актыўна выкарыстоўваюцца дзелавыя гульні, тэлебачанне, самастойная праца ў бібліятэках.

Пасля заканчэння навучання выпускнікам ЭНА прапануюцца будучыя месцы працы. Колькасць іх трохі болей (85-86), чым кантынгент выпускнікоў. Выбар добраахвотны, але абавязковая ўмова - гарантыя працаўладкавання. Пры гэтым выпускнік, як правіла, займае месца дзяржаўнага чыноўніка, які пакідае працу ў сувязі з узростам.

Аналіз арганізацыі і зместу падрыхтоўкі кіраўнікоў у Францыі дазваляе зрабіць пэўныя вывады для падрыхтоўкі кіраўнікоў для сферы на магістэрскай ступені.

Бялоў У.І.,
дацэнт

## РАЗВІЦЦЕ ТВОРЧАГА ЎЯЎЛЕННЯ СТУДЭНТАЎ НА ЗАНЯТКАХ ПА РЭЖЫСУРЫ КУЛЬТУРНА-ЗАБАЎЛЯЛЬНЫХ ПРАГРАМ

Працэс практычных заняткаў прадугледжвае шэраг узаемазвязаных элементаў. Гэта пастаноўка мэты заняткаў; абмеркаванне заданняў і сродкаў дасягнення канчатковых вынікаў; улік асаблівасцей мыслення і творчых здольнасцей студэнтаў; улік сістэмы прафесійных ведаў, якія забяспечваюць поспех творчай работы; кантроль за выкананнем заданняў.

Практычныя заняткі па рэжысуры культурна-забаўляльных праграм са студэнтамі першага курса спецыялізацыі «сацыяльны педагог» перш за ўсё накіраваны на развіццё іх творчага ўяўлення. Таму адна з галоўных задач - выявіць творчы тып мыслення студэнтаў, каб скарэкціраваць іх творчыя магчымасці ў развіцці ўяўлення.

Для рашэння гэтай задачы мы праводзім практыкаванне «Апавяданне па карціне». Напрыклад, студэнтам прапануецца ўважліва разгледзець карціну В.Максўскага «На бульвары» і апісаць усе тое, што, на іх погляд, з'яўляецца цікавым. Апісанне карціны пятнаццаццю студэнтамі аналізавалася па асаблівай методыцы, вынікі былі абагульнены наступным чынам:

- адказы сухія, лаканічныя, канстатуючыя (пяць);
- адказы эмацыянальныя, экспрэсіўныя (сем);
- апісанне карціны вялося ад першай асобы альбо ад імя прыдуманага персанажа (тры).

Аналіз адказаў сведчыць аб тым, што першая група студэнтаў адносіцца да мысліцельнага тыпу, другая група адпавядае мастацкаму тыпу, трэцяя - тыпу вобразнаму, акцерскаму.

Высвятленне тыпалогіі мыслення студэнтаў дае магчымасць выкладчыку распрацаваць індывідуальны падыход да кожнага студэнта і больш эфектыўна развіваць яго творчае ўяўленне.

Далей на практычных занятках студэнты атрымалі творчае заданне: распрацаваць задуму відовішчнай праграмы на тэму «Дарагая мая жанчына».

З мэтай актывізацыі творчага ўяўлення студэнтаў забаранялася крытыка ідэй і падтрымлівалася ўсе тое, што прыйдзе на думку ў працэсе выканання заданняў.

Кожны студэнт, які карыстаецца сваім вопытам і прафесійнымі ведамі, атрыманымі на лекцыйных занятках, ствараў задуму пастаноўкі і свае меркаванні фіксаваў на паперы. Аналіз першапачатковай задумы паказаў, што большасць студэнтаў выкарыстоўвалі знаемыя вершы, прысвечаныя жанчыне, на аснове іх стваралі паэтычную кампазіцыю. Некалькі студэнтаў зрабілі спробу адысці ад шаблона і паказалі арыгінальнае бачанне тэмы. У іх задуме лейтматывам была вернасць жанчыны, яе ўменне чакаць каханага.

Праграма мела пяць блокаў. У змесце кожнага блока адлюстроўвалася падзея, у цэнтры якой быў вобраз жанчыны. Гэты падыход даваў магчымасць выкарыстоўваць у якасці матэрыялу для пастаноўкі ўрыўкі з мастацкіх твораў, п'ес, мемуараў. Музычным лейтматывам была песня на верш М.Забалоцкага «Дарагая мая жанчына». Пры далейшай «мазгавой атацы» ўсіх студэнтаў па гэтай задуме сюжэтны ход стаў больш канкрэтным, з'явіліся новыя элементы. На наш погляд, цікавай знаходкай было выкарыстанне рушнікоў, якія трансфармаваліся ў вобразы дрэў, дарогі, калыскі, акенца, што давала магчымасць узмацніць вобразнае рашэнне тэмы.

Такім чынам, у працэсе развіцця творчага ўяўлення студэнтаў на працягу заняткаў неабходна:

- вызначыць актуальную тэму, ідэю;
- акцэнтаваць увагу на галоўным у выбранай тэме;
- генерыраваць ідэі шляхам распрацоўкі рознабаковых падыходаў да тэмы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ